Інфарм-укол

## АПЕЛЬСІНАВЫ ВОДАР АБУДЖАЕ ДАБРЫНЮ

**Англійскі вучоны Дж. Дод выявіў: самая распаўсюджаная прычына стрэсу, дэпрэсіі, няўпэўненасці ў сваіх сілах і недаацэнкі ўласных дасягненняў — асяроддзе агрэсіўных да чалавека пахаў.**



Стан здароўя, настрой і самаўспрыманне надоўга могуць сапсаваць не толькі выхлапныя газы, але і проста нейтральныя, чужыя пахі. Аздараўленчаму ўздзеянню пахаў лепш паддаецца той, хто ўмее вобразна мысліць і працаваць правым паўшар'ем, а сярод прадстаўніц прыгожай паловы такіх большасць. «Левапаўшарныя» мужчыны складаней адгукаюцца на нюхальныя стымулы, і таму араматэрапія патрэбна ім у двайной дозе. Так што эфірныя маслы варта палюбіць усім, і выбіраць іх не па прынцыпу «падабаецца-не падабаецца», а ў залежнасці ад іх вартасцяў. Так аніс, сандал ці ружа дапамогуць асобам з нізкай самаацэнкай, тым, хто трывожыцца па дробязях. Ад страхаў і начных кашмараў — ладан і іланг-іланг. Калі нічога не радуе — ляўзея, пальмаружа, лаванда і мірт. Лічыцца, што пах апельсіна робіць чалавека больш добрым, ванілі — спагадлівым, вербену — удалым і справядлівым, карыцы — мэтанакіраваным, ядлоўцу — адданым, мяты — міласэрным і спачувальным, лімона — натхняе, лаванды — паглыбляе ў сябе, мацярдушкі — ратуе ад гневу і раздражнення, грэйпфруту — ад самаздаволення. Маяран, базілік, карыца, лімоннік і ядловец унушаюць веру ва ўласныя сілы. Герань і рамонак пазбаўляюць ад комплексу непаўнацэннасці і залежнасці ад чужога меркавання. Самыя простыя спосабы араматэрапіі — прыняцце ванны з некалькімі кроплямі эфірнага масла.

## ШТО ПЕРАШКАДЖАЕ ПРАЦАВАЦЬ?

**Псіхолаг Раян Джонсан з універсітэта Фларыды (ЗША) правёў эксперымент з дзвюма групамі студэнтаў: іх пасадзілі ў шумных пакоях, з імітацыяй гулу натоўпу, і прапанавалі запісаць як мага больш спосабаў выкарыстання такога прадмета, як нож.**

Студэнтам адной групы далі зразумець, што ад іх не чакаюць высокіх вынікаў з-за шуму, які перашкаджае засяроджваць увагу. У выніку яны зрабілі работу значна горш, чым тыя, хто не атрымаў падобнага апраўдання. Паводле меркавання псіхолагаў, не сам фонавы шум, а стаўленне да яго як да змякчальных абставінаў адмоўна адбілася на працаздольнасці. Такім чынам, калі знаходзіцца прычына працаваць не ў поўную сілу, мы з ахвотай ёю карыстаемся.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**

**У суд Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці** паступіла заява аб аб'яўленні адсутным без вестак грамадзяніна **ГРЫБАВА Сяргея Міхайлавіча**, 23.02.1970 года нараджэння, ураджэнца вёскі Малінаўка Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці, які пражываў у г. Дзяржынску па вул. Кірава, д. 5, кв. 27. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна Грыбава С.М., паведаміць іх суду Дзяржынскага раёна Мінскай вобл. на адрас: Мінская вобл., г. Дзяржынск, вул. Фамінfamіных, д. 24а на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

# У АЎТАРСКАЙ ЛЯЛЬКІ І «БАЦЬКА», І «МАЦІ» — АДЗІН ЧАЛАВЕК

## ...толькі сапраўдны творца можа стаць аўтарам гэтага шэдэўра

**Шостая рэспубліканская выстава аўтарскай лялькі «Балаганчык» праходзіць гэтымі днямі ў мастацкай галерэі Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці. Варта адзначыць, што да 90-х гадоў XX стагоддзя сур'ёзна разважаць аб такім відзе мастацтва, як аўтарская лялька, на прасторах былога Саюза нават не даводзілася. Магчыма, хтосьці і майстраваў лялек у той час, але шырока распаўсюджанай мастацкай з'явай гэта не было. І ўжо тым больш ніхто нават не дапускаў думкі, што стварэнне аўтарскіх лялек можа быць сур'ёзнай прафесіяй, якая прыносіла б пастаянны даход. Для беларускіх лялечнікаў, на жаль, і сёння стварэнне лялек з'яўляецца, хутчэй, хобі, чым галоўным заняткам у жыцці. Чаго ніяк не скажаш аб іх расійскіх калегах — у нашых суседзяў новы жанр мастацтва развіваецца проста фантастычнымі тэмпамі. Адна за другой ствараюцца галерэі, дзе заўсёды можна ўбачыць і набыць работы вядучых расійскіх і замежных майстроў, у розных кутках краіны адкрываюцца школы для навучання тэхналогіям і сакрэтам стварэння лялек, арганізоўваюцца курсы, ладзяцца майстар-класы, лялечнікі аб'ядноўваюцца ў прафесійныя саюзы, у Маскве штогод праводзіцца Міжнародны лялечны салон, лялечнікі інтэнсіўна асвойваюць Сусветную павуціну, выпускаецца нават спецыялізаваны часопіс «Лялечны майстар», разлічаны на ўсіх, каго цікавіць лялечнае мастацтва.**

— Мы пакуль што знаходзімся яшчэ толькі ў пачатку гэтага шляху, — расказвае журналісту «Звязды» **арт-дырэктар лялечнага праекта «Балаганчык» і кіраўнік Школы лялечнага дызайну Мінскага палаца дзяцей і моладзі Ірына ШТЭФАН**. — Хоць сёння над стварэннем аўтарскіх лялек у нас працуюць ужо чалавек семдзесят. Паверце, што для нашай краіны гэта не так ужо і мала. Ёсць сярод беларускіх майстроў і так званая эліта — гэта мастакі, якія выстаўляюцца і прадаюць свае работы за межамі Беларусі: Марына Скідан, Таццяна Трафімовіч, Аляксей Мартынаў, Вольга Старынская, Ірына Ражко і некаторыя іншыя. Выстаўляліся мы і на апошнім Міжнародным лялечным салоне ў Маскве — наша экспазіцыя называлася «Вялікія лялькі маленькай краіны». Так склалася, што для ўдзелу ў міжнародным салоне (а гэта, дарэчы, даволі дарагое «задавальненне») былі адабраны менавіта вялікія лялькі, але гэта была, хутчэй, выпадковасць. Аднак калі арганізатары салона прапанавалі мне даць нашай экспазіцыі назву, то, гледзячы на творы нашых мастакоў, у мяне адразу ўзнікла асацыяцыя — вялікія лялькі маленькай краіны. Па колькасці вялікіх лялек на адзін квадратны метр мы былі бясспрэчнымі лідарамі (*смяецца*) і, відома ж, прыцягнулі да сябе ўвагу...

Нашым чытачам будзе цікава даведацца, што Ірына Штэфан узначальвае на сёння рух лялечнікаў на Беларусі і з'яўляецца своеасаблівым сувязуючым звяном з іх калегамі з іншых краін свету, яна прывозіць у Мінск сучасныя матэрыялы для вырабу лялек і новыя тэхналогіі. Пры гэтым першая яе спецыяльнасць — інжынер-метэаролаг, а другая — эканаміст.

— У мяне часта цікавяцца, дзе можна паглядзець мае работы, — смяецца Ірына. — Гэта на Захадзе не трэба тлумачыць, што ёсць арганізатары, а ёсць мастакі. А ў нашым грамадстве існуе меркаванне, што калі ты сам робіш лялькі, то сам і павінен іх прадаваць. Распаўсюджана таксама меркаванне, што для стварэння лялек абавязкова патрабуецца мастацкая адукацыя. Але давайце паразважаем, а каго можна лічыць прафесіяналам у гэтай справе? Чалавека, які атрымаў спецыяльную мастацкую адукацыю ці чалавека, які дасягнуў у сваіх работах высокага мастацтва ўзроўню? Я ўвогуле лічу, што падрыхтаваць мастака-лялечніка ў сценах навучальнай установы ў прынцыпе немагчыма, таму што лялечнае мастацтва — гэта сінтэтычны від мастацтва, як матэматычная фізіка ці фізічная хімія. Чалавек, які ствараe лялькі, павінен быць адначасова і скульптарам, і дызайнерам, і візажыстам, і цырульнікам, і партным. Напрыклад, пашыў абутку для лялек — гэта асобная навука. А майстар-лялечнік робіць усё ад пачатку і да канца: ад эскіза да ўвасаблення. Майстры, якія працуюць над гістарычнымі лялькамі, павінны таксама разбірацца ў гісторыі касцюма, моды, прычосак і макіяжу.

Я асабіста лічу, што лялькі могуць ствараць усе, хто да гэтага імкнецца, а не толькі людзі з мастацкай падрыхтоўкай. І наадварот, далёка не ўсе мастакі могуць ствараць лялькі, якія трапляюць у катэгорыю высокага мастацтва.

На апошнім «Балаганчыку» мы вывучалі меркаванні наведвальнікаў выставы, хацелі даведацца, ці ёсць у іх жаданне самім далучыцца да сакрэтаў лялечнага мастацтва. І высветлілася, што сярод ахвотнікаў стварыць лялькі ёсць і міліцыянеры, і студэнты, і эканамісты, і бухгалтары, і сакратары. Я распрацавала вучэбную праграму для Школы лялечнага дызайну, якая спачатку прадугледжвала два накірункі — лялькі з фарфору і пластыку. Затым дабавіўся тэкстыль, адкрыўся юніёр-клас і школа для самых маленькіх «Цацка разам з матуляй», куды пяці-шасцігадовыя дзеці прыходзяць разам з бацькамі і майструюць лялькі, так бы мовіць, з падручных матэрыялаў. Ідэя стварэння юніёр-класа з'явілася зусім невыпадкова. Мы пераканаліся ў тым, што пераважная большасць дзяцей не ведаюць, як працаваць з тым ці іншым матэрыялам і што ўвогуле з яго можна зрабіць. Працоўнае навучанне ў школе сёння дзецям гэтых навыкаў не дае, матэрыялазнаўства таксама не выкладаецца. Да таго ж творчыя здольнасці фарміруюцца ў дзяцей яшчэ ў раннім узросце, але сучасныя бацькі настолькі занятыя працэсам зароблівання грошай, што для развіцця ўласнага дзіцяці часу ў іх зусім не застаецца. Вырасла цэлае пакаленне дзяцей, якія не могуць творча мысліць. Ім для гэтага патрабуецца пэўны штуршок. А ў нашай школе бацькі прыносяць з дому ў клас рознае «смецце» і мы пачынаем з гэтых непатрэбных рэчаў ствараць прыгажосць. У выніку задаволеныя ўсе: і матулі, якія праводзяць час побач са сваімі дзецьмі, і дзеці, якім тут дазваляецца абсалютна ўсё.



Анфіса ВІНАГРАДАВА «Мелодыя далекіх сусветаў» (тэкстыль, карункі, вышыўка).



Ірына РАЖКО «Дамавы» (фарфор).

Больш старэйшым дзецям мы дазваляем паспрабаваць на працягу года ўсе матэрыялы: і фарфор, і пластык, і тэкстыль, каб яны маглі вызначыцца, які з матэрыялаў ім больш падыходзіць. Мы ніколі не вызначаем мастацкія схільнасці сваіх будучых выхаванцаў — прымаем абсалютна ўсіх, хто хоча засвоіць тэхналогіі і сакрэты стварэння лялек. Галоўнае — быць творчым і цярплівым чалавекам, бо на стварэнне адной лялькі можа спатрэбіцца і некалькі месяцаў, і паўгода, а, можа, і год. Таму сакрэты лялечнага мастацтва ў нас асвойваюць і дзеці, і падлеткі, і студэнты Акадэміі мастацтваў.

Скептыкам хачу сказаць, што лялечнік нумар адзін у Беларусі Марына Скідан па сваёй асноўнай спецыяльнасці — фізік. Пэўны час таму яна разам з мужам апынулася на Поўначы, але для яе там не знайшлося работы па спецыяльнасці. Марына ўладкавалася ў Дом дзіцячай творчасці, дзе стала разам з дзецьмі рабіць лялькі ў тэхніцы пап'е-машэ. А сёння ёй няма роўных у гэтым відзе аўтарскай лялькі. Рызыкую выклікаць гнеў прадстаўнікоў акадэмічнай школы, але я лічу, што мастацтва лепкі дадзена чалавеку ад прыроды, паколькі кожнае дзіця пазнае свет праз тактыльныя адчуванні. А вось мастацтву жывапісу і сапраўды трэба вучыцца...

Апошнім часам усё больш папулярным становіцца калекцыянаванне аўтарскіх лялек. У Расіі і Еўропе калекцыянеры гатовы плаціць за работы вядомых майстроў дзесяткі тысяч долараў. У Маскве нават створаны клуб калекцыянераў, члены якога абменьваюцца і прадаюць адзін другому свае лялькі. У Беларусі цэны, напэўна, як і даходы насельніцтва, крыху больш сціплыя — сярэдняя цана на аўтарскую ляльку даходзіць да 2 тысяч долараў. Для пачынаючых калекцыянераў своеасаблівае імгненне ўдачы — дэбютныя выстаўкі мастакоў, дзе работы пачынаючых майстроў можна набыць больш танна, бо калі майстар, так бы мовіць, «раскруціць» сваё імя, кошт яго работ адразу павялічыцца.

— Я заўсёды кажу мастакам, што для таго, каб прадаваць свае работы, трэба, па-першае, пастаянна ўдзельнічаць у розных выставах, а па-другое, мець сваю калекцыю, бо калекцыя надае мастаку значнасць, — кажа Ірына Штэфан. — У калекцыянераў павінна быць магчымасць выбару, да таго ж многія калекцыянеры адсочваюць работы аднаго і таго ж мастака. Інтэр'ерная лялька — адзін з самых модных напрамкаў. Многія нашы мастакі супрацоўнічаюць з дарагімі мэблевымі салонамі, і гэта цалкам апраўдана. Там адразу можна ўбачыць, як лялька становіцца непаўторным упрыгажэннем вашага інтэр'еру. Ёсць устойлівы попыт і на партрэтную ляльку, але, на жаль, мала мастакоў працуюць у гэтым напрамку. Гэта даволі складаны від аўтарскай лялькі, паколькі мастак павінен па фатаграфіі перадаць партрэтнае падабенства чалавека. Падарунак, бясспрэчна, арыгінальны. Але той, чалавек, якому ён прызначаецца, павінен быць да гэтага маральна падрыхтаваны. Партрэтнае падабенства, безумоўна, павінна прысутнічаць, але ж лялька надзяляецца і пэўным характарам. Калі ў чалавека з пачуццём гумару ўсё ў парадку, то праблем не будзе, але ж далёка не кожны можа ставіцца да сябе гумарыстычна.

Ёсць у Ірыны Штэфан адна ідэя, для ўвасаблення якой патрабуюцца аднадумцы. Ірына хацела б зрабіць ляльку неад'емнай часткай высокай моды і гандлю. Скажам так: усё новае — гэта добра забытае старое. У сярэднявеччы ў Еўропе ўжо існавалі так званыя модныя лялькі, якія служылі для дэманстрацыі найноўшых накірункаў моды: іх строі поўнасцю паўтаралі ўсе фасоны, тканіны і самыя дробныя дэталі адзення прыдворных дам і кавалераў. У палацах у велікасвецкіх дам «жылі» дзве лялькі — Вялікая і Маленькая Пандора. Вялікая Пандора дэманстравала раскошныя строі (адзенне на выхад), а Маленькая Пандора — утульныя хатнія сукенкі. Абедзве былі страшэннымі модніцамі і для іх спецыяльна заказваліся капялюшыкі, сукенкі, панчохі, чаравікі і ўпрыгажэнні. Французскія дамы мод адпраўлялі свае лялькі ў Англію, Германію, Італію, Іспанію. І толькі ў XX стагоддзі на змену модным лялькам канчаткова прыйшлі глянцавыя часопісы.



Алена ЮНЧУВІЧ «Мары Лепрыкона».

— Мне хацелася б, каб аўтарскія лялькі выкарыстоўваліся для дэманстрацыі модных калекцый адзення, абутку, ювелірных вырабаў, каб яны прыйшлі на змену безаблічным манекенам, якія сёння «ўпрыгожваюць» вітрыны нашых буцікоў, — дзеліцца сваімі планамі Ірына Штэфан. — Тым больш што ў нас ёсць мастакі, якія робяць роставыя лялькі, гэта значыць, у сапраўдны рост чалавека. Усё гэта можна вельмі прыгожа абыграць. Спадзяюся, што мая ідэя кагосьці зацікавіць...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

**Адзінокім, маладым маці,** а таксама чалавеку, які з-за хваробы або па старасці не можа даглядаць за сабой і пастаянна мае патрэбу ў пабочнай дапамозе, Дзяржаўная ўстанова «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Першамайскага раёна г. Мінска» з 22 кастрычніка плануе аказваць дзве новыя платныя паслугі насельніцтву. Пры неабходнасці можна будзе запрасіць на дом не толькі сядзелку для чалавека, які страціў здольнасць да самаабслугоўвання, але і нянька для дзіцяці. У комплекс паслуг сядзелкі ўваходзіць падагрэў ежы, кармленне, мыццё посуду, змена бялізны, вынас судна. Нянька, акрамя таго, што дагледзіць за дзіцем, пакорміць яго, памяняе памперс, дапаможа малому апранууцца і пагуляе з ім на вуліцы.

Паслугі сядзелкі і нянькі будуць аказваць будучыя медыкі, а таксама вопытныя сацыяльныя работнікі.

**Кантактныя тэлефоны: 281 61 89, 280 48 06.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.32 | 16.14 | 8.42 |
| Віцебск — | 7.27 | 15.59 | 8.32 |
| Магілёў — | 7.23 | 16.05 | 8.42 |
| Гомель — | 7.13 | 16.07 | 8.54 |
| Гродна — | 7.47 | 16.31 | 8.44 |
| Брэст — | 7.41 | 16.37 | 8.56 |

**Месяц**

*Маладзік 10 лістапада. Месяц у сузор'і Казярога.*

**Імяніны**

*Пр. Аляксандра, Аляксея, Анатоля, Івана, Сяргея, Усевалада, Якава;*

*К. Валянціны, Станіславы, Хрысціны, Аркадзя, Мікалая, Станіслава.*

## НАДВОР'Е на заўтра




— слабая геамагнітная бура
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

Геамагнітныя ўзрушэнні: 2 гадз. | 5 гадз. | 8 гадз. | 11 гадз. | 14 гадз. | 17 гадз. | 20 гадз. | 23 гадз.

## ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +1..+3°С | КІЕЎ +1..+3°С | РЫГА -1..+1°С |
| ВІЛЬНЮС -1..+1°С | МАСКВА -3..-1°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ -5..-3°С |

## 13 лістапада

Дзве даты

**1927 год** — 80 гадоў таму заснаваны Гродзенскі заалагічны парк, самы старэйшы ў Беларусі.

**1937 год** — адбыліся першыя выбары ў Вярхоўны Савет СССР, які склікаўся згодна са «сталінскай» Канстытуцыяй 1936 года.




Цытата дня:

***Большая частка людзей нават не спрабуе выйсці за межы сваіх магчымасцяў; за сваё жыццё яны так і не спрабуюць даведацца, на што яны здольныя і на што — няздольныя. Яны не ведаюць, што ім не пад сілу... Крыўдна пражыць жыццё, не пазнаўшы сябе — чалавека, які быў табе, быццам, бліжэй за ўсіх і якога ты так любіў».***

**Данііл Гранін (нар.1919), рускі пісьменнік.**

## Усміхнёмся!

Вегетарыянскі клуб «Гарох» запрашае на музычныя вечары.

☺

**Кліент — адміністратару:**
**— Можна зрабіць так, каб у мяне з 0:00 да 9:00 не было Інтэрнэта?**
**— Спаць хочацца?**
**— Так...**

☺

Мара заходняга бізнэсмена — зарабіць мільён, нашага — украсці мільярд.




ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА I КВАРТАЛ І I ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ
МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ — газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых саветаў
СВАЯ СПРАВА — бізнэс, эканоміка, фінансы
Наш культурны асяродак ЖЫВАНДОЛЯ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
КУПІ ЛЕПШАЕ! тавары, паслугі, цэны
КРАІНА ЗДАРОЎЯ

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 8800 рублёў на месяц<br>26400 рублёў на квартал<br>52800 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 8300 рублёў на месяц<br>24900 рублёў на квартал<br>49800 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 14000 рублёў на месяц<br>42000 рублёў на квартал<br>84000 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 12800 рублёў на месяц<br>38400 рублёў на квартал<br>76800 рублёў на паўгоддзе |
| ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку) | | |
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 7460 рублёў на месяц<br>26400 рублёў на квартал<br>44760 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 6990 рублёў на месяц<br>20970 рублёў на квартал<br>41940 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 9938 рублёў на месяц<br>29814 рублёў на квартал<br>59628 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 9431 рубель на месяц<br>28293 рублі на квартал<br>56586 рублёў на паўгоддзе |

ОАО «Управление механизации № 91» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

повторно проводят открытый аукцион по продаже части производственной базы в составе: часть административного здания пл. 168,5 кв.м, здание гаража пл. 196,7 кв. м, ограждение (бетонный забор), по адресу: Молодечненский район, д. Носилово, улица Новая, 1. Начальная цена с НДС — 59 618 560 бел. руб. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объект продается без условий. Договор купли-продажи подписывается в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению местного исполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях проведения аукциона. Аукцион состоится 20.11.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 19.11.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Тел: (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt .by.

РУП «ЛОГОЙСКИЙ КОМХОЗ» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

проводят открытый аукцион по продаже здания цеха № 4 (общ. пл. 1 217, 2 кв. м), расположенного по адресу: г. Логойск, ул. Победы, 102. Площадь зем. уч. 0, 3700 га. Начальная цена — 450 000 000 бел. руб. с НДС. Задаток в размере 5 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Объект продается без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению райисполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 13.12.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 12.12.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

КОНТАКТНЫЙ ТЕЛЕФОН (8017) 224 61 34
САЙТ В ИНТЕРНЕТЕ: WWW.RLT.BY

*В публикации объявления РУП «Кобальт»*
о проведении тендера
на закупку оборудования
(газета «Звязда» № 213 от 9.11.2007 г.)
обращаться по адресу:
*Минская обл., Логойский р-н, г.п. Плещеницы, пер. Промышленный, 1 и по тел.: 8 01774 78 3 65, моб. 8 029 776 38 73, факс 71 2 54. Листопад Леонид Владимирович.*

КІРМАШ — штотыднёвы рэкламны выпуск № 34 (567)
аддзел рэкламы ☎ 287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ПРАДАЕЦЦА

■ Дом з усімі выгодамі ў вёсцы, ці абмяняю на кватэру.
Тэл. 8 0163 43 24 16.

■ Дом драўляны ў г. Крупкі на беразе р. Бобр з г/п, пячное і газавае ацяпленне, тэлефон. Нядорага.
Тэл. 8 01796 58 447, пасля 18.00.

■ «VW-Вента» 1993 г.в., 1,9 ТД, сіні, нядорага.
Тэл. 8 01792 55 725, 8 029 931 82 28.

■ Прычэп да матаблока МТЗ (не эксплуатаваўся), нядорага.
Тэл. 8 029 589 54 18.

■ «Аўдзі-100» 1994 г.в., бензін, 5700 у.а., торг, «VW-Пасат» 1991 г.в., 1,8 мона, універсал, выдатны стан, 2950 у.а., торг.
Тэл. 8 029 507 88 19.

■ «VW-Пасат» В3, 1994 г.в., 1,6 ТД, універсал, зімовыя шыны, АКБ, чорны металік, выдатны стан, 4400 у.а., торг.
Тэл. 8 029 507 88 19.

■ Кацёл для лазні на цвёрдым паліве.
Тэл. 8 017 242 72 42.

■ Мыйка нержавеючая, б/к памер 80х60, радыятар да «Аўдзі-80» 1988—91 г.в.
Тэл. 8 029 873 47 07.

■ Кабан жывой вагой 150 кг, 5 тыс. рублёў за 1 кг.
Тэл. 8 029 507 88 19.

■ Свіння жывой вагой 120 кг, 5 тыс. рублёў за 1 кг.
Тэл. (8 01718) 42 445 пасля 18.00.

■ Акардэон «Weltmeister» з рэзанатарамі (ламаныя дэко) 11х5 рэгістраў з пашпартам і інструкцыяй.
Тэл. 8 029 298 94 26.

■ Халадзільнік «Снайге», ложак драўляны з матрацам, плуг.
Тэл. 8 017 291 64 92.

■ Газавая пліта «Гефест-3200», новая, усе функцыі, нядорага.
Тэл. 8 029 624 30 96.

■ Козы высокаўдойныя (5—6 л малака), 8-месячныя козачкі і племянныя козлікі.
Тэл. 8 02234 35 646, 8 029 841 53 53.

### КУПЛЮ

■ Трусоў (да 60 км ад Мінска).
Тэл. 8 029 357 64 51.

■ Дом ці кватэру ў Мінску ці раёне без пасрэднікаў.
Тэл. 8 029 764 42 91.

■ Кватэру-дом з усімі выгодамі ў Ваўкавыску ці раёне.
Тэл. (8 0216) 21 01 80.

■ Трактар МТЗ.
Тэл. 8 029 655 07 16.

■ Старыя фотаапараты, аб'ектывы, значкі і паштоўкі па фотатэматыцы.
Тэл. 8 029 850 17 29.

■ ПД8, рэдуктар.
Тэл. 8 01718 34 389.

■ Рухавік УД-1 ці УД-2 да матаблока, с/гаспадарчае абсталяванне да матаблока.
Тэл. 8 029 183 44 70.

### РОЗНАЕ

■ Прапала лайка, белая з рыжым, у в. Любяга Уздзенскага раёна. Таго, хто знойдзе, чакае ўзнагарода. Просьба патэлефанаваць па нумары 8 029 507 88 19.

ЗВЯЗДА
**КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**
Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ваша прозвішча, адрас, хатні тэлефон.

Тэлефон для даведак 287 17 79.

Пашпарт серыя________ № ________ Выданы________

Подпіс________ Дата________

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

html: www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.347. Індэкс 63850. Зак. № 6162. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12